**УДК 2-9(476) (XVII)**

# АНТЫКЛЕРЫКАЛЬНЫЯ НАСТРОІ ШЛЯХТЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII СТАГОДДЗЯ

***М.А. ПЕТРАЎСКАС***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы)***

*На прыкладзе маёмасных канфліктаў даследуецца дачыненне каталіцкай шляхты Вялікага Княства Літоўскага да аўтарытэту царквы ў першай палове XVII стагоддзя. Судовыя цяжбы землеўласнікаў з прадстаўнікамі духавенства ілюструюць працэс легітымацыі царкоўнай улады ў прававой сістэме Вялікага Княства Новага часу. Прыведзены прыклады канфрантацыі і кампрамісаў паміж шляхтай і афіцыйнай царквой. Узмацненне пазіцый духавенства ў структурах дзяржаўнай улады выклікала пратэст прывілеяваных пластоў грамадства. Уплыў Рэфармацыі, эканамічны эгаізм, узмацненне ролі свецкага права ва ўсіх сферах жыцця, ідэалогія шляхецкай дэмакратыі разглядаюцца як крыніцы дэсакралізацыі аўтарытэту царквы. Прыведзеныя прыклады дазваляюць гаварыць аб секулярызацыі ўяўленняў абывацеляў XVII стагоддзя пра канфесійны абавязак. Падтрымка царквы з боку вярхоўнай улады паступова абмяжоўвала магчымасці шляхты і магнатаў ігнараваць інтарэсы духавенства.*

**Уводзіны.** Пашырэнне ў XVI – першай палове XVII стагоддзя індывідуалістычнага мыслення, якое характарызавалася прыярытэтам асабістых інтарэсаў над грамадскім абавязкам, паўплывала на канфесійныя ўзаемаадносіны і канчаткова аслабіла асновы сярэднявечнага калектывізму, які, па выразу расійскага філосафа А. Івіна, "толькі часткова аб'ядноўваў думкі сваіх індывідаў, навязваючы ім рэлігійную ідэалогію" [1, с. 277]. Імкненне шляхты Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) да аўтаноміі і эканамічнай самадастатковасці спалучалася з жаданнем зменшыць залежнасць не толькі ад вярхоўнай свецкай улады, але і ад царквы – найбольш аўтарытэтнага інстытута, які вызначаў умовы і формы падпарадкавання асобы агульнаму грамадскаму дабру.

Мэтай працы з'яўляецца вывучэнне дэсакралізацыі (пазбаўлення "святасці") адносін прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя да царкоўных інстытутаў на землях ВКЛ у ранні Новы час і выяўленне сувязі паміж пратэстнымі настроямі каталіцкай шляхты і зменамі ўяўленняў пра канфесійны абавязак.

**Крыніцы дэсакралізацыі.** Канфлікты з царкоўнымі інстытутамі на глебе маёмасных, фінансавых, побытавых пытанняў сведчылі пра ўзрастанне свецкіх прынцыпаў рэгулявання ўзаемаадносін людзей. У гістарыяграфіі індывідуалізм і праявы эгаізму свабодалюбівай асобы ў XVI – пачатку XVII стагоддзя часта атаясамліваюцца з уплывамі пратэстантызму. У беларускай навуцы гэтую думку адным з першых выказаў У. Пічэта, які адзначаў, што "рэфармацыйны рух садзейнічаў развіццю індывідуалізму сярод літоўскай знаці і вызваленню яе ад уплыву каталіцкай царквы" [2, с. 681].

Асновы секулярызацыі адносін "шляхецкага народу" да царквы на землях ВКЛ былі закладзены ў "залатых вольнасцях", пад якімі разумелася і свабода веравызнання, замацаваная актам Варшаўскай канфедэрацыі 1573 года і Статутам ВКЛ 1588 года. Супрацiўленне першанству дзяржавы ў канфесійных пытаннях цесна звязвалася з абаронай шляхецкіх праў. Прырода апошніх па-рознаму растлумачана ў гістарыяграфіі. Украінская даследчыца Н. Якавенка адзначала, што ў XVI–XVII стагоддзях "нарматыўны парадак, які быў надзелены агульнапрынятай легітымнасцю, і тып сацыяльных паводзін шэраговага індывіда былі шчыльна звязаны з ушанаваннямі права не ў яго палітычным ці юрыдычным вымярэнні, а ў сэнсе светаўспрымання ўвогуле, як велічыні вечна справядлівай, трансцэндэнтнай [3, с. 81]. "Залатыя вольнасці" ў пачатку Новага часу былі асновай ментальнага вобраза (думак, паводзін, кругагляду, светаўспрымання) шляхты ВКЛ.

Цесная сувязь рэлігійнай, працоўнай, палітычнай, штодзённай сфер дзейнасці, якой характарызавалася жыццё абывацеляў у Сярэднявеччы і ў пачатку Новага часу, дазваляе разглядаць шляхецкую апазіцыю ўладзе царквы не толькі як з'яву секулярызацыі. Напружаная соймавая барацьба за захаванне прынцыпаў рэлігійнага плюралізму ў першай палове XVII стагоддзя тлумачылася цеснай сувяззю паміж канфесійнай свядомасцю і ідэаламі навачаснай дэмакратыі. Праявы гэтай свядомасці ў розных сферах публічнага жыцця сведчылі пра набожнасць чалавека і ўплывалі на яго рэпутацыю. Гісторык, ксёндз і грамадскі дзеяч Станіслаў Аржэхоўскі (Orzechowski) у сярэдзіне XVI стагоддзя сцвярджаў, што шляхецкія вольнасці паходзяць ад касцёла і з'яўляюцца прамым вынікам дзейнасці духавенства, таму тыя, хто вырашыў адступіць ад каталіцкай веры, павінны клапаціцца пра сваю свабоду [4, s. 35]. Рэлігійныя падмуркі дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай у Новы час выклікаюць цікавасць у навукоўцаў. Сучасная беларус-

кая даследчыца Н. Поляк выказала думку пра непадзельнасць залатых вольнасцей і каталіцкай веры ў парламенцка-анархічным укладзе краіны [5, с. 26].

Са свайго боку, вярхоўная ўлада стварала і ахоўвала ўмовы выканання грамадскага абавязку, часткай якога была канфесійная дысцыпліна. Паводле тэорыі канфесіяналізацыі нямецкага гісторыка Х. Шылінга, узмацненне дзяржавы ў ранні Новы час, фарміраванне свецкіх кіруючых сіл і легітымізацыя іх улады паступова адсоўвалі царкву на другі план [6, с. 214]. Гэты пастулат дастасавальны да гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай XVII стагоддзя з улікам асабліва важнай ролі закона і свецкага права. Узмацненне індывідуалізму ў рэлігійных пытаннях спалучалася з абаронай свабод і вольнасцей, замацаваных соймавымі канстытуцыямі. Міжканфесійныя стасункі сістэмна рэгуляваліся інструментамі свецкага права.

Складанасць сімбіёзу дзяржавы і царквы на землях ВКЛ праявілася ва ўвядзенні суду Трыбуналу compositi iudicii (які меў змешаны склад – свецкія дэпутаты і рымска-каталіцкія прадстаўнікі) для вырашэння спрэчных спраў з удзелам вернікаў грэцкай рэлігіі [7, s. 225]. Дзякуючы такому складу суддзяў рашэнні не на карысць каталіцкага кліру былі асуджаныя на правал. Існаванне compositi iudicii ускладняла адносіны паміж абывацелямі, дзяржавай і царквой. Адбывалася гэта не толькі ў супрацьстаянні праваслаўных і пратэстанцкіх сіл з уладай і каталіцка-уніяцкай супольнасцю. Трансфармацыя падпарадкавання аўтарытэту царквы ў падпарадкаванне закону выклікала пратэстныя настроі сярод “шляхецкага люду” незалежна ад канфесійных прыхільнасцей.

**Спрэчкі вакол дзесяціны.** Суадносіны ідэалаў шляхецкай дэмакратыі ў ВКЛ у Новы час з узроўнем падпарадкавання чалавека царкоўнай уладзе ілюструюць судовыя справы першай паловы XVII стагоддзя аб спагнанні дзесяціны з прыватных маёнткаў каталіцкай шляхты на карысць касцёлаў.

Калі ўпершыню ўспыхнуў канфлікт паміж ксяндзом гедройцкага касцёла Св. Барталамея Сымонам Шаўклеўскім (Szymon Szawklewski) і ўладальнікамі маёнтка Дубаўшчызна (Dubowszczyzna, старая назва Szostakowo) панам Юзафам Пяткевічам і яго жонкай Ганнай дакладна невядома. У студзені 1614 года скарга каталіцкага святара на гэту шляхецкую сям’ю трапіла на разгляд віленскага земскага суда. Абодва бакі даручылі абарону сваіх інтарэсаў спецыяльным упаўнаважаным, таму перад суддзёй Жыгімонтам Гедройцам разгарнулася напружанае супрацьстаянне юрыдычна падрыхтаваных людзей.

Зацятасць і прынцыповасць канфлікту паміж плябанам Шаўклеўскім і панам Пяткевічам мелі свае прычыны. На працягу многіх дзесяцігоддзяў гедройцкай парафіі аказвалася падтрымка з боку ўладароў вакольных мясцовасцей. Яшчэ ў пачатку XVI стагоддзя гедройцкія князі запісалі касцёлу Св. Барталамея даход з трох корчмаў, забараніўшы іншыя піцейныя месцы на адлегласці дзвюх міль ад храма. Кожны чацвер і на вялікія святы людзі з’язджаліся з усёй акругі да тых корчмаў і на торг. Мясцоваму плябану выплачваўся падатак з продажу мёда, піва і быдла. Прывілеі часоў Жыгімонта I замацоўвалі прэферэнцыі гедройцкага плябана на вечныя часы, пасля чаго нават “samy Hospodar” гэтага статусу не мог парушыць [8, арк. 2 адв.].

На працягу больш трыццаці год гедройцкая парафія не мела пастаяннага святара. За гэты час змяніліся многія ўладальнікі навакольных маёнткаў. Выплаты дзесяціны касцёлу рэгуляваліся старымі прывілеямі сярэдзіны XVI стагоддзя. На іх спасылаўся новы плябан і настойваў, што князі Гедройцы з даўніх часоў запісалі дзесяціну збожжа і мёд з Дубаўшчызны на парафіяльны касцёл. “Вялікае спусташэнне ў той плябаніі рабілася” таму, што пан Пяткевіч адмаўляўся ад усіх выплат. Прэтэнзіі да ўладальніка Дубаўшчызны Шаўклеўскі неаднаразова спрабаваў давесці да суда, але яго намаганні прынеслі поспех толькі ў 1614 годзе.

Марцін Жарнеўскі, прадстаўнік шляхціцаў, найперш паставіў пад сумненне магчымасць Шаўклеўскага быць пазоўнікам у справе дзесяціны касцёлу. Ён заявіў, што яго бок “ні ў якое разнагалоссе не ўступае”, пакуль плябан не дакажа, што з’яўляецца шляхціцам. Згодна канстытуцыі 1607 года (а таксама ранейшых 1560 і 1588 гадоў) канонікамі і прэлатамі (прэлат – высокая пасада ў структуры рыма-каталіцкай царквы) не маглі быць “плебеі і простага стану людзі, (а) толькі з бацькі і з маткі народа польскага шляхецкага, indigenis Regni et Dominiorum” (лац. “нашчадкі ўладароў і ўласнікаў”) [9, s. 437]. На такі закон спаслаўся Жарнеўскі і падкрэсліў, што ў гедройцкай плябаніі з даўніх часоў “людзі шляхецкага народу былі” [8, арк. 8 адв.]. Пачуццё адзінства, якім былі аб’яднаны Пяткевіч і шматлікія шляхціцы, мацней уплывала на стыль паводзінаў, чым аўтарытэт прадстаўнікоў царквы.

У адказ на дзёрзкую заяву з боку Пяткевіча абаронца плябана спаслаўся на ліст 1603 года “на лаціне”, у якім князі Гедройцы далі згоду на прызначэнне плябанам Шаўклеўскага. Пад дакументам стаялі подпісы не ўсіх прадстаўнікоў знакамітага роду, аднак склад падпісантаў уключаў людзей, вядомых сваёй прыхільнасцю каталіцкай царкве. Мельхіёр Гедройць, жамойцкі біскуп, прыхільнік Контррэфармацыі і апякун літоўскамоўнага пісьменства, яго брат Марцін, вількамірскі падсудак Юры Гедройць, Жыгімонт Гедройць, віленскі падсудак, які ў 1614 годзе ўжо ў якасці суддзі разглядаў справу Шаўклеў-

скага, бацька пана Юзафа Малхер (Malcher, літ. Merkelis) Пяткевіч і іншыя асобы далі сваю згоду на абранне новага плябана.

У гэтым пераліку цікавай з’яўляецца постаць Пяткевіча-старэйшага, віленскага земскага пісара і сакратара Галоўнага літоўскага Трыбунала. У 1598 годзе коштам Малхера ў Вільні быў выдадзены “Polski z Litewskim katechism”. Напісаны на дзвюх мовах, катэхізіс паўтараў многія палажэнні кальвінскага вучэння [10]. Верагодна Катэхізіс 1600 года, складзены для абываценяў ВКЛ, быў выдадзены пры ўдзеле гэтага ж чалавека [11, s. 97].

Рэпутацыя яшчэ аднаго прадстаўніка Пяткевічаў (гербу Pomian) – жмудскага біскупа Юрыя (Jerzy III, памёр у 1574 г.) – звязвалася з рэфармацыйным рухам. Па некаторых звестках, Юры Пяткевіч разам з паствай (“jego szczypie”) і шматлікімі шляхетнымі людзьмі “ад веры прававернай адлучыўся”, а “тых часоў зараза (г. зн. Рэфармацыя – *М. П.*) беды ў касцёле Божым стварыла” [12, s. 297]. Таму яго спадкаемца на біскупстве, Мельхіёр Гедройць, застаў у паслушэнстве толькі сем каталіцкіх князёў.

На пратэстны настрой уладара Дубаўшчызны і на яго імкненне супрацьстаяць аўтарытэту царквы маглі ўплываць рэфармацыйныя схільнасці продкаў.

Невысакароднае паходжанне плябана выклікала раздражненне Юзафа Пяткевіча, які настойваў, што няшляхціц не мог быць парафіяльным святаром. У канстытуцыях гаварылася пра вышэйшыя пасады рымска-каталіцкай царквы – канонікаў і прэлатаў. Прадстаўнік Пяткевіча настойваў, што плябан лічыўся старэйшым сярод падначаленых яму алтарыстаў і вікарыяў, а значыць, з’яўляўся прэлатам.

Правамоцнасць Шаўклеўскага падмацоўваў ліст віленскага біскупа Бенедыкта Войны 1604 года. У ім іерарх пацвярджаў легітымнасць новага гедройцкага святара, а значыць, права адстойваць інтарэсы парафіі ў судзе. Плябан заклікаў больш не чыніць перашкоды ў вырашэнні справы і адзначыў, што калі “пан Пяткевіч да ксяндза плябана мае (пытанне), няхай яго да суда належнага, гэта значыць да Яго міласці ксяндза біскупа віленскага адрасуе”. Пяткевіч з такой аргументацыяй прымірыцца не пажадаў і падкрэсліў намер захоўваць “вольны голас” у сваёй абароне, “да чаго права дарогу пакажа”. Такімі словамі шляхціц падкрэсліў разуменне “права” вышэйшым за традыцыю ці аўтарытэт царкоўнай улады.

Адрозныя адносіны да “права канстытуцый” і да “права па звычаю” стала асновай супрацьстаяння шляхціцаў з царквой. Пяткевіч настойваў, што яго справу павінен разглядаць каралеўскі суд падчас наступнага сойму. Паводле канстытуцыі 1607 года, дзесяціны з шляхецкіх маёмасцей, якія існавалі “паводле звычаю” і не былі вызначаны фундушамі ці судовымі дэкрэтамі, загадвалася адкладаць “do kompozycyi blizko przyszley” [9, s. 436].

Плябан Шаўклеўскі меў вопыт супрацьстаяння з непакорнымі шляхціцамі, што было засведчана ў трох дэкрэтах “кола духоўнага” Галоўнага Трыбунала. Яны вызначалі дзесяціну на карысць плябаніі з прыватных маёнткаў і былі зацверджаны подпісам канцлера Льва Сапегі. У чарговы раз пазіцыя каталіцкага святара абапіралася на аўтарытэт свецкай улады. Сярод тых, хто ўступіў у спрэчку з гедройцкім плябанам, быў Барталамей Крыжаноўскі. Трыбунал “кола духоўнага” (які напалову складаўся з прадстаўнікоў царквы) вырашыў спрэчку з ім на карысць гедройцкай плябаніі, і гэта рашэнне зацвердзіў асэсарскі каралеўскі суд (прыдворны каралеўскі суд, які меў свецкі склад). У выніку шляхціц быў вымушаны прадаць свой маёнтак Войтэху Быхаўцу, з якім Шаўклеўскі знайшоў паразуменне.

На думку Пяткевіча, папярэднія шляхціцы саступілі Шаўклеўскаму з-за “нядбання і праўнай неабароны”. У адрозненне ад іх, пан Юзаф падрыхтаваўся адстойваць свае інтарэсы, але “w zadnoy reczy nichto nizakoho terpeti y tezara ponositi ne maiet, tolko kozdy sam za sebie” [8, арк. 12 адв.].

Спрэчка вакол “застарэлай” дзесяціны прывяла да непаразумення сярод земскіх суддзяў. Жыгімонт Гедройць аддаў перавагу праву канстытуцый, па якіх жылі “не дзве і не тры асобы, а ўся Рэч Паспалітая”, таму падобныя справы загадаў накіроўваць да “кола вялікага свецкага (г)енеральнага”, гэта значыць да соймавага суда [8, арк. 13]. Падсудак жа настойваў, каб канфлікты паміж царквой і свецкімі ўласнікамі разглядалі “odno osoby Duchownye spolne z Sweckimi”. Такі парадак быў прапісаны ў Статуце ВКЛ 1588 года (Арт. 32, раздзел III), па якому канфлікты свецкіх асоб з людзьмі духоўнага стану вырашаліся шасцю трыбунальскімі суддзямі, тры з якіх прадстаўлялі духавенства [13]. У выніку справа накіроўвалася на разгляд Галоўнага Трыбунала [8, арк. 13].

Супраціўленне Пяткевіча і яго грэбаванне аўтарытэтам царкоўнай улады ўяўляецца тыповым для шляхецкага асяродку ВКЛ пачатку Новага часу. Эвалюцыя права і ўзмацненне ролі дзяржаўных інстытутаў у рэгуляванні грамадскіх узаемаадносін і рэлігійных пытанняў уплывалі на фарміраванне секулярызаванага светапогляду асобы. Для прывілеяваных груп адстойванне маёмасных праў ці канфесійных інтарэсаў цесна перапляталася з абаронай свабод шляхецкага люду. Традыцыя ўшанавання царквы і яе аўтарытэт у пачатку Новага часу саступілі месца прымату свецкага права і закону. Таму актыўныя спробы Пяткевіча не дапусціць духоўных асоб да разгляду спрэчкі з гедройцкім плябанам сведчылі пра асаблівы

грамадскі рэзананс, які быў выкліканы ўключэннем прадстаўнікоў царквы (той яе часткі, дзейнасць якой адпавядала цэнтралізатарскім памкненням вярхоўнай улады) у свецкія структуры ранненавачаснай дзяржавы. Супраціўленне гэтым тэндэнцыям праяўлялася ў абароне рэлігійных свабод і падтрымцы магутнымі шляхецкімі родамі разнаверцаў (праваслаўных і пратэстантаў).

Праз Трыбунал compositi judycii абумоўлены традыцыяй абавязак паступова замацоўваўся ў праве. Не толькі шляхта, але і магнаты гублялі магчымасць ігнараваць інтарэсы царквы. У 40-я гады XVII стагоддзя прадстаўнікі знакамітага роду Радзівілаў былі вымушаны шукаць кампрамісу з плябанам крошынскага касцёла (у мястэчку Крошын, цяпер вёска ў Баранавіцкім раёне) Паўлам Грабоўскім [14, арк. 1]. Спрэчку наконт абавязкаў перад царквой распачаў Жыгімонт Кароль Радзівіл, кавалер Мальтыйскага ордэна. Канфлікт абвастраўся жаданнем магната абмежаваць у сваіх уладаннях лоўлю рыбы людзьмі плябана. Як і ў Дубаўшчызне, у Крошыне існавала карчма, даход з якой належаў мясцоваму касцёлу. Радзівіл жа дамагаўся пабудовы ўласных шынкоў.

У хуткім часе (пасля смерці Жыгімонта ў 1642 г.) уладальнікам Крошына стаў брат мальтыйскага рыцара, вялікі маршалак ВКЛ Аляксандр Людвіг. У 1646 годзе за нежаданне выплаціць дзесяціну суд змешанага складу пакараў магната вялікім штрафам. Аднак Радзівіл дамогся кампрамісу з касцёльнымі ўладамі. На маёнтак Крошын ён пералічыў 5 тыс. злотых, пасля чаго з гэтай сумы на карысць плябаніі штогод выплачвалася 400 злотых. Віленскі біскуп Аўрам Война (Abraham Woyna) пагадзіўся вызваліць радзівілаўскі маёнтак ад дзесяціны. Больш рашучай была пазіцыя Радзівіла ў адносінах іншых прывілеяў касцёла. Лоўлю рыбы ўладар Крошына дазволіў "толькі ў межах плябанскіх і берагах, якія не выходзяць за гэтыя межы". Таксама Аляксандр Людвіг пацвярджаў свае права пабудаваць уласныя пітныя ўстановы. Крошынскім жыхарам і прышлым людзям дазвалялася "вольнае ўжыванне напою" як у плябанскай, так і ў радзівілаўскіх корчмах [14, арк. 1].

Каб уздзейнічаць на шляхту, каталіцкія іерархі звярталіся за дапамогай да дзяржаўных дзеячаў. У гэтым праяўляўся сімбіёз свецкай улады і царквы ў фарміраванні "грамадства падданых" на землях ВКЛ.

У 1647 годзе Януш Радзівіл, які займаў пасаду цівуна ў Рэтаве (літ. Retavas), атрымаў скаргу жамойцкага біскупа (верагодна, Юрыя Тышкевіча) на мясцовую шляхту. Тая адмаўлялася выконваць неабходныя абавязкі перад касцёлам. У адказ Радзівіл напісаў грозны ліст сваім падуладным, у якім патрабаваў "усё аддаць, што касцёлу рэтаўскаму належыць, і не інакш" [15].

**Заключэнне.** Для каталіцкай шляхты Вялікага Княства Літоўскага адстойванне асабістых інтарэсаў у спрэчках з царквой уяўлялася не менш важным, чым для прадстаўнікоў праваслаўнага і пратэстанцкага асяроддзя. У адрозненне ад апошніх, канфлікты католікоў з уладамі грунтаваліся на эканамічным эгаізме, а не на канфесійных супярэчнасцях. Рэгуляванне ўзаемаадносін паміж царкоўнымі інстытутамі і грамадствам праз свецкія прававыя механізмы ўплывала на аўтарытэт царквы сярод жыхароў ВКЛ Новага часу. Існаванне "права па звычаю", якое рэгулявала традыцыйны абавязак перад духавенствам на аснове "састарэлых" ці непісаных прывілеяў, было асновай канфліктаў паміж шляхтай і святарамі. Суд compositi iudicii уплываў на ўзаемаадносіны прадстаўнікоў розных хрысціянскіх канфесій. У выніку спалучэння свецкіх і царкоўных інструментаў падпарадкавання грамадства канфесійны абавязак у ВКЛ у першай палове XVII стагоддзя становіцца нормай грамадзянскай дысцыпліны. Падтрымка дзяржавай каталіцкага духавенства значна абмяжоўвала магчымасці шляхты ігнараваць інтарэсы царквы.

## ЛІТАРАТУРА

1. Ивин, А. Философия истории: учеб. пособие / А. Ивин. – М.: Гардарики, 2000. – 528 с.
2. Пичета, В. Белоруссия и Литва XV – XVI вв. (исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития) / В. Пичета. – М.: Изд-во АН СССР, 1961. – 814 с.
3. Яковенко, Н. Паралельний світ. Дослідження з історії уявлень та ідей в Україні XVI–XVII ст. / Н. Яковенко. – Київ: Критика, 2002. – 416 с.
4. Baczewski, S. Szlachectwo. Studium z dziejów idei w piśmiennictwie polskim: druga połowa XVI wieku – XVII wiek / S. Baczewski. – Lublin: UMCS, 2009. – 280 s.
5. Поляк, Н. Дысідэнты-пратэстанты беларускіх зямель у знешнепалітычных стасунках Прусіі і Рэчы Паспалітай (канец XVI – пачатак XVII ст.) / Н. Поляк // Весці БДПУ імя М. Танка. – Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2005. – № 1(43). – С. 25–29.
6. Schilling, H. Konfessjonalizacja. Kościół i państwo w Europie doby przednowoczesnej. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 2010. – 640 s.
7. Kempa, T. Wobec Kontrreformacji. Protestanci i prawosławni w obronie swobód wyznaniowych w Rzeczypospolitej w końcu XVI i w pierwszej połowie XVII wieku / T. Kempa. – Toruń: Wyd. Adam Marszałek, 2007. – 624 s.

8. Lietuvos valstybes istirijos archyvas. F. 694. – Ap. 1. – B. 3279. Материалы имущественно-судебного характера по Гедройцкому костёлу. 1528–1779 гг.
9. Volumina Legum. Przedruk zbioru praw. T. II. – Petersburg: Nakładem i drukiem Józafata Ohryzki, 1859. – 482 s.
10. Pociūte-Abukevičienė, D. Katekizmas / D. Pociūte-Abukevičienė [Электронный ресурс] Режим доступа: http://www.lle.lt/search3.htm. – Дата доступа: 20.05.2011.
11. Kużmina, D. Katechizmy w Rzeczypospolitej XVI i początku XVII wieku / D. Kużmina. – Warszawa: Nauka – Dydaktyka – Praktyka, 2002. – 168 s.
12. Niesiecki, K. Herbarz Polski. T. I. / K. Niesiecki. – Lipsk: Nakładem i drukiem Breitkopfa i Haertela, 1839–1846. – 582 s.
13. Статут Великого княжества Литовского 1588 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.grodno.by/grodno/history/statut_vkl_1588. – Дата доступа: 18.01.2011.
14. Lietuvos mokslu akademijos biblioteka (LMAB). Rankraščių skyrius. F. – 127. − 951. Письмо Александра Людвига Радивилла. 1646.
15. Lietuvos mokslu akademijos biblioteka (LMAB). Rankraščių skyrius. F. – 12. − 709. Письмо Я. Радивила. 1647.

*Паступіў 18.04.2013*

## ANTICLERICAL SENTIMENT OF THE ARISTOCRACY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE 1ST PART OF THE 17TH CENTURY

***M. PETRAUSKAS***

*On the example of property conflicts explores the attitude of the Catholic gentry to the authority of the church in the first half of the XVII century. The litigation between landowners and clergymen illustrates the process of legitimizing the ecclesiastical authority in the legal system of the GDL of the Modern times. There are the examples of confrontation and compromise between the nobility and the official church. Strengthening the position of the clergy in the governance structures caused protest of the privileged strata of society. The influence of the Reformation, the economic self-interest, the role of the civil law in all spheres of life, the ideology of szlachta democracy are named as the sources of authority desacralization of the church. These examples suggest the ideas of the secularism in the attitude of XVII century inhabitants to the confessional duty. The support of the church by the supreme power gradually limited the opportunities of the gentry and magnates to ignore the interests of the clergy.*